# «ЗОРНЫ МІР»

## прапануе супрацоўніцтва

**Наш карэспандэнт гутарыць з дырэктарам новага цэнтра, створанага ў Гомелі пры падтрымцы Федэрацыі касманаўтыкі СССР, А. Э. ЮНІЦКІМ.**

**— Анатоль Эдуардавіч, раскажыце, калі ласка, аб мэтах і задачах вашай арганізацыі.**

— Цэнтр «Зорны мір» будзе актыўна падтрымліваць праграму выкарыстання касмічнай прасторы ў інтарэсах усяго чалавецтва, прадоўжыць распрацоўку перспектыўнай канцэпцыі безракетнай індустрыялізацыі космасу, сканцэнтраваўшы сваю дзейнасць на рэалізацыі праекта «Агульнапланетны транспартны сродак» (АТС).

**— Але ж гэтая праблема патрабуе значных сродкаў.**

— Вось таму мы праз федэрацыю касманаўтыкі СССР звярнуліся з просьбай дапамагчы цэнтру на этапе яго станаўлення. З задавальненнем магу адзначыць, што бюро праўлення Савецкага Фонду міру прыняло рашэнне пералічыць на наш рахунак 000609208 у аперацыйным упраўленні Жылсацбанка Гомеля 150 тысяч рублёў. Спадзяемся мы і на добраахвотныя ўзносы арганізацый і асобных людзей, якія жадаюць унесці свой уклад у ажыццяўленне праекта АТС, які з'яўляецца альтэрнатывай «зорным войнам».

Зараз мы займаемся чыста «зямнымі» справамі: цэнтр жа павінен ажыццяўляць сваю дзейнасць на аснове поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання. Таму, з'яўляючыся юрыдычнай асобай, ён можа заключаць дагаворы на выкананне розных заказаў і падбіраць спецыялістаў таго або іншага профілю, якія выказалі жаданне іх выканаць.

**— Якую ж работу вы зможаце ім прадаставіць?**

— Практычна кожнае буйное прадпрыемства або ўстанова мае даволі значны задзел заказаў і распрацовак, з якімі ўласнымі сіламі справіцца не можа з-за адсутнасці спецыялістаў патрэбнага профілю або адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. А галіновыя інстытуты і КБ загружаны іншай работай або не хочуць брацца за дробязь.

З другога боку, у Гомелі і вобласці працуюць тысячы маладых вучоных і інжынераў. Большасць з іх у сілу розных прычын не могуць рэалізаваць свае веды і здольнасці. Ці можна лічыць такое становішча нармальным, тым больш сёння, у эпоху перабудовы? Вось чаму наш цэнтр стане пасрэднікам паміж творчымі людзьмі і арганізацыямі, якія маюць патрэбу ў правядзенні навукова-даследчых доследна-эксперыментальных, канструктарскіх, тэхналагічных і іншых работ.

Зараз ідзе фарміраванне штата, паспяхова ствараецца «банк выканаўцаў», якія, заўважу, за поўнасцю выкананую работу могуць атрымаць 50 і больш працэнтаў ад кошту заключанага з заказчыкам дагавору. Цэнтр пачаў супрацоўніцтва з вядомым у горадзе кааператывам «Здароўе». У абмен на навукова-тэхнічныя кансультацыі і дапамогу ён аддае 15 працэнтаў свайго прыбытку ў фонд «Зорнага міру». Дагавор з Маскоўскім кааператывам шматмэтавага комплекснага сервісу дазволіць нам ажыццявіць камп'ютэрызацыю цэнтра і стварыць навуковую базу даных.

Прыцягальная сіла «Зорнага міру» і ў тым, што тут творчы чалавек сустрэне сваіх аднадумцаў, зможа выказаць сваю думку, атрымаць кваліфікаваную дапамогу больш вопытных спецыялістаў.

У перспектыве — стварэнне кааператываў, лабараторый, канструктарскіх бюро, школ, правядзенне семінараў і канферэнцый. Напрыклад, школа юнага касманаўта, або школа, дзе будзе весціся пошук здольных дзяцей, у якіх упаўне можа быць будучыня вучонага. Вучаць жа ігры на баяне, а чаму б не вучыць творчасці, працы думкі? У нас ёсць людзі, якія любяць дзяцей, умеюць з імі працаваць.

**Нарэшце, ці трэба гаварыць пра тое, што работы па рэалізацыі праекта АТС знаходзяцца на пярэднім краі дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу?**

Нашай маладой арганізацыі патрэбны работнікі, аднадумцы. На першым часе мы запрашаем да сябе інжынераў, юрыста, эканамістаў, галоўнага бухгалтара, начальніка навукова-даследчага аддзела. Шукаем зараз памяшканне, але пакуль нічога няма. Магчыма, у кагонебудзь ёсць ідэі? Падкажыце. Чакаем. А мы ў сваю чаргу маглі б падключыць свой творчы патэнцыял для вырашэння праблем той арганізацыі або прадпрыемства, якія нас прытуляць. Наш тэлефон: 55-73-16.

**У. ЛАРЫЁНАЎ.**